**ДРУГІ (ВОЧНЫ) ЭТАП МІНСКАЙ ГАРАДСКОЙ АДКРЫТАЙ**

**ІНТЭРНЭТ-АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ**

**I тур 2010 - 2011 навучальны год**

**Комплексная работа**

**8 клас**

**Заданне 1. “Прыгатуйце” мачанку, размясціўшы сказы ў неабходнай паслядоўнасці.**

*Максімальная колькасць балаў – 3*

МАЧАНКА ПА-СЯЛЯНСКУ

1. Да мачанкі падаць бліны або вараную бульбу.
2. Кавалкі свініны і сырой сялянскай каўбасы абсмажыць.
3. Паставіць на 20-25 хвілін у духоўку.
4. Дадаць соль, лаўровы ліст, пакласці кавалачкі падскваранага разам з цыбуляй сала, а таксама свініну і каўбасу.
5. Пшанічную або ячную муку развесці халоднай вадой і ўліваць у кіпень, увесь час памешваючы, да ўтварэння рэдкай мучной падліўкі.

**Заданне 2. Правільна запішыце словазлучэнні, знайшоўшы неадпаведнасці ў іх арганізацыі.**

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| | |
|---|---|
| 1. анонс на канцэрт | |
| 2. датычыцца нам | |
| 3. зарука для плённага развіцця | |
| 4. пачцівы да старых | |
| 5. хваляваццa пра дзяцей | |

**Заданне 3.** *У падборцы прыведзеных сказаў адзначце «лішні». Растлумачце свой выбар.*

*Максімальная колькасць балаў – **3**.*

1. Якія знаёмыя назвы і словы! Якая цудоўная родная мова!
2. “Марылька, якая ты прыгожая сёння! “- чуваць Косцеў голас. “Ці толькі сёння?” – пытае Марылька.
3. Уставай, беларуская зямля, - чуеш, пачалося!
4. А колькі ўсіх ў памяці вузлоў, што нас звязалі, родны край, з табой.
5. І дзе на свеце ёсць такая, як Нёман, рэчачка другая?!

**Заданне 4. Разбярыце сказы па членах сказа (графічна) і вызначце, якія з варыянтаў прыведзеных канструкцый адпавядаюць проціпастаўленню *“сказ неразвіты–развіты”*.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Неразвіты сказ | Варыянт развітага сказа |
|---|---|
| 1. Скончыўся лівень!.. | Вось ужо і скончыўся лівень!.. |
| 2. Конік застракатаў. | У ржышчы жытнёвым конік застракатаў. |
| 3. На снезе след. | На непарушным снезе лёгкі заечы след. |
| 4. Сонца. | Вясна і сонца. |

| | |
|---|---|
| 5. Кружыць ліст. | Кружыць і не падае ліст. |

**Заданне 5. Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі дрэў і тым, сімвалам чаго яны з’яўляюцца ў традыцыйнай культурнай спадчыне беларусаў. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

| | |
|---|---|
| **А.** Арэх | **1.** гэта маладзец, ператвораны ў дрэва праз праклён маці (часам бацькі) або па сваёй волі. |
| **Б.** Алешына | **2.** сімвал прытулку, дрэва якое ў беларусаў забараняецца ссякаць бо на ім сядзіць Божая Маці калі сыходзіць на зямлю. |
| **В.** Вярба | **3.** свяшчэннае дрэва у якое ніколі не б’е маланка. |
| **Г.** Груша | **4.** дрэва, галінкамі з лісцем якога параць гладышы каб ніхто не зачараваў малако. |
| | **5.** гэта дзяўчына, якая каб ўратавацца ад замужжа са старым, перакінулася ў дрэва. |

**Заданне 6. Падкрэсліце выказнікі ў сказах, вызначце і запішыце іх тып.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Сказ** | **Тып выказніка** |
|---|---|
| 1. *На полі неба лес страхлівы стаіць зацяты, нерухлівы* (Якуб Колас) | |
| 2. *І штось незразумелае шуміць-пяе чарот...* (У. Жылка) | |
| 3. *Ён можа працаваць* (І.Шамякін). | |
| 4. *Уладзік зараз – шмыг у дзверы!* (Якуб Колас) | |
| 5. *Сонца села ў цёмна-сінюю хмару – нябесную ладдзю...* (В.Іпатава) | |

**Заданне 7. Аднавіце каардынацыю паміж дзейнікам і выказнікам, уставіўшы патрэбныя літары. Растлумачце свой выбар.**

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1) Вакол у розных мясцінах свяціл[__]ся ў цемры некалькі агнёў (І. Мележ).
2) У мяне з’явіл[__]ся шмат запытанняў… (А. Мрый).
3) Мінул[__] два тыдні (С. Давідовіч).
4) Прайшл[__] гадзіны дзве ў гэтай бясконцай плыні думак (І. Шамякін).

**Заданне 8. Калі Вы добра ведаеце беларускую нацыянальную фразеалогію, то лёгка адновіце «схаваныя» прыказкі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1) Што ‘немагчыма ўтаіць, што само сябе выдае’? –
2) Чым ліквідуюцца ‘непрыемныя вынікі якіх-небудзь дзеянняў ці стану’?
3) Якую аперацыю трэба правесці, ‘перш чым зрабіць нешта сур’ёзнае’? –
4) Калі ёсць надзея ‘пачуць у бліжэйшы час што-небудзь новае’? –
5) Чым міжволі выдае сябе той, хто ‘правінаваціўся ў чым-небудзь? –

**Заданне 9. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 3 .*

***

І тады закахалася хмара...

У паплавы, ад расы прамяністыя,
І ва ўсю Беларусь маю чыстую,
Ў мары бору ў палёў абшары.

І заплакала ад кахання
І слязою чыстай абмыла
Ў се абшары зямлі маёй мілай
Ўсе калыскі яе і магілы
Ўсе змярканні яе і світанні.

І пад птушак зялёны гоман
Нарадзіліся для абшараў,-
Плод кахання бору і хмары,-
Мой Дняпро і Бяроза і Нёман.

**Заданне 10. Запоўніце пустыя клеткі ў табліцы:**

*Максімальная колькасць балаў – 3 .*

| *Тып мастацкага тэксту* | *Аўтар* | *Твор* | *Жанр* | *Спосабы і прыёмы раскрыцця зместу* |
|---|---|---|---|---|
| Вершаваны | Якуб Колас | "Ручэй" | Верш | 1)<br>2) |
| Празаічны | | "Сірочы хлеб" | Апавяданне | 1) партрэт<br>2) дыялог |

**Заданне 11. Падкрэсліце "лішні" элемент у пераліку і растлумачце свой выбар:**

*Максімальная колькасць балаў –3.*

Партрэт, паэма, пейзаж, дыялог, апісанне.

**Заданне 12. Устаўце прапушчаныя словы:**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б'ецца, ўецца ________, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

Навакол усё паветра
Ў струнах сонца залатых,-
Ён дрыжачымі крыламі
Звоніць ________ чутна ў іх.

І ліецца хваляй песня –
Ціхі, ясны гімн вясне.
Ці не _______ напявае,
Навявае яго мне?

**Заданне 13. Запішыце назву вышэй цытаванага твора і яго аўтара.**

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 14. Вызначце назву твора, пра які ідзе гаворка, яго аўтара і галоўнага героя:**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Асуджэнне духоўнага адчужэння дарослых дзяцей ад бацькоўскага дома. Клопат маці пра дзяцей і душэўная чэрствасць, няўвага да яе з боку малодшага пакалення. Усведамленне сынам віны перад бацькамі, шчымлівае пачуццё жалю да маці. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы вясковага побыту, выразная характарыстыка герояў праз іх паводзіны і ўчынкі, мастацкія дэталі: "Ён моўчкі глядзеў, як жанчыны таўклі ў багажнік вядро з мочанымі яблыкамі, а яно не ставілася, месца не хапала, нават слоікі не было як утачыць, а яшчэ на зямлі стаяла вядзёрная каструля з капустаю, ручніком абвязаная. Павымалі сумкі, пачалі ставіць нанава. Куткі нарэшце ўсяму пазнаходзілі, а зачыніць багажнік не маглі".

**ДРУГІ (ВОЧНЫ) ЭТАП МІНСКАЙ ГАРАДСКОЙ АДКРЫТАЙ**

**ІНТЭРНЭТ-АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ**

**І тур** **2010 - 2011 навучальны год**

**Комплексная работа**

**8 клас**

## ДАВЕДКІ

| **Заданні** | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *11* | *12* | *13* | *14* | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **3** | **5** | **3** | **5** | **7** | **5** | **6** | **5** | **3** | **3** | **3** | **3** | **2** | **3** | **56** |

**Заданне 1.**

ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ СКАЗАЎ: ***2, 5, 4, 3, 1.***

**КАМЕНТАРЫЙ: мінус 0, 5 бала за кожную памылку.**

**Заданне 2.**

| | |
|---|---|
| 1. анонс на канцэрт | анонс ***аб*** канцэрце |
| 2. датычыцца нам | датычыцца ***нас*** |
| 3. зарука для плённага развіцця | зарука ***плённага развіцця*** |
| 4. пачцівы да старых | пачцівы ***са старымі*** |
| 5. хваляваецца пра дзяцей | хваляваецца ***за дзяцей*** |

**Заданне 3.**

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: **3**

Сказ **3** – клічны, пабуджальны. Сказы **1**, **2**, **4, 5** – клічныя.

**Заданне 4.**

**КАМЕНТАРЫЙ:** 3 балы за разбор, 1 бал за кожную правільна ўказаную пару, мінус 0,5 бала за кожную памылку,

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: пары ***1, 2.***

| **Неразвіты сказ** | **Варыянт развітага сказа** |
|---|---|
| 1. Скончыўся лівень!.. | Вось ужо і скончыўся лівень!.. |
| 2. Конік застракатаў. | У ржышчы жытнёвым конік застракатаў. |
| 3. На снезе след. | На непарушным снезе лёгкі заечы след. |
| 4. Сонца. | Вясна і сонца. |
| 5. Кружыць ліст. | Кружыць і не падае ліст. |

| | |
|---|---|

**Заданне 5.**

АДПАВЕДНАСЦЬ: ***А3Б4В5Г2***

**КАМЕНТАРЫЙ: па 1 бале за кожную адпаведнасць, па 0, 5 бала за кожны правільна пастаўлены знак прыпынку, мінус 0, 25 бала за кожную пунктуацыйную памылку.**

*А3:* ***Арэх**, **ляшчына*** **–** свяшчэннае дрэва**,** у якое ніколі не б'е маланка.

*Б4:* ***Вольха**, **алешына*** – дрэва, галінкамі з лісцем якога парадь гладышы**,** каб ніхто не зачараваў малако.

*В5:* ***Вярба*** – гэта дзяўчына, якая**,** каб уратавацца ад замужжа са старым, перакінулася ў дрэва.

*Г2:* ***Груша*** – сімвал прытулку, дрэва**,** якое ў беларусаў забараняецца ссякаць**,** бо на ім сядзіць Божая Маці**,** калі сыходзіць на зямлю.

(Энцыклапедычны слоўнік *«Беларуская міфалогія»*)

**Заданне 6.**

| | |
|---|---|
| **1.** *На полі неба лес страхлівы **стаіць зацяты, нерухлівы*** (Якуб Колас) | ***састаўны іменны*** |
| **2.** *І штосьць незразумелае **шуміць-пяе** чарот...* (У. Жылка) | ***просты дзеяслоўны (ускладнены)*** |
| **3.** *Ён **можа працаваць*** (І.Шамякін). | ***састаўны дзеяслоўны*** |
| **4.** *Уладзік зараз – **шмыг** у дзверы!* (Якуб Колас) | ***просты дзеяслоўны*** |
| **5.** *Сонца **села** ў цёмна-сінюю хмару – нябесную ладдзю...* (В.Іпатава) | ***просты дзеяслоўны*** |

**Заданне 7.**

**КАМЕНТАРЫЙ: па 0,5 бала за кожную правільна ўстаўленую літару, па 1 бале за правільнае тлумачэнне кожнага сказа.**

1) Вакол у розных мясцінах свяціл**[а]**ся ў цемры некалькі агнёў. (І. Мележ).
2) У мяне з'явіл**[а]**ся шмат запытанняў… (А. Мрый).
3) Мінул**[а]** два тыдні. (С. Давідовіч).
4) Прайшл**[о]** гадзіны дзве ў гэтай бясконцай плыні думак. (І.Шамякін).

**КАМЕНТАРЫЙ: 1, 2 сказы**: спалучэнню назоўніка са словамі *многа, мала, колькі, багата, некалькі, шмат* адпавядае форма адзіночнага ліку выказніка

**3, 4 сказы**: форма адзіночнага ліку патрабуецца ад выказніка, калі дзейнік складаецца з колькаснага лічэбніка *два* і слова *тыдзень, гадзіна* (*мінул**а** два тыдні, прайшл**о** гадзіны дзве*). Да таго ж, у чацвёртым сказе перадаецца значэнне прыблізнай колькасці.

**Заданне 8.**

**КАМЕНТАРЫЙ: мінус 0,25 бала за кожную моўную, арфаграфічную, граматычную памылку.**

1) ***шыла*** (***Шыла** ў мяшку не схаваеш*).
2) ***клінам*** (*Клін **клінам** выбіваюць*).
3) ***адмераць*** (*Сем разоў **адмерай**, адзін раз адрэж*).
4) ***пераначаваўшы*** (***Пераначуем** – болей пачуем*).
5) ***шапкай*** (*На злодзеі **шапка** гарыць*).

**Заданне 9.**

**КАМЕНТАРЫЙ: мінус 0, 25 бала за кожную пунктуацыйную памылку.**

І тады закахалася хмара...
У паплавы, ад расы прамяністыя,
І ва ўсю Беларусь маю чыстую,
Ў мары бору**,** ў палёў абшары.

І заплакала ад кахання**,**
І слязою чыстай абмыла
Ўсе абшары зямлі маёй мілай**,**
Ўсе калыскі яе і магілы**,**
Ўсе змярканні яе і світанні.

І пад птушак зялёны гоман
Нарадзіліся для абшараў,-
Плод кахання бору і хмары,-
Мой Дняпро, і Бяроза, і Нёман.

**Заданне 10.**

**Правільныя адказы:** пейзаж, апісанне, Янка Брыль.

**Заданне 11.**

**КАМЕНТАРЫЙ: за вызначэнне слова 1 бал, за тлумачэнне 2 балы.**

**Правільны адказ:** паэма.

Жанр твор; іншыя словы абазначаюць спосабы і прыёмы раскрыцця мастацкага зместу.

**Заданне 12.**

**Правільныя адказы:** шпаркі, ледзьве, сэрца.

**Заданне 13.**

**Правільныя адказы:**“Маёвая песня”,Максім Багдановіч.

**Заданне 14.**

**Правільныя адказы:** апавяданне “Дзяльба кабанчыка”, Віктар Карамазаў, Сцяпан.